УДК 159.922

*С. В. Венідзіктаў*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт (Беларусь)*

# ДЭВІЯЦЫІ АСОБЫ Ў ПРАСТОРЫ ІНТЭРНЭТ-КАМУНІКАЦЫІ

*У артыкуле абагульняюцца асноўныя праявы дэвіяцый у прасторы інтэрнэт-камунікацыі, іх прычыны і прыкметы. Раскрываецца змест трох груп камунікатыўных дэвіяцый: рознага роду залежнасцей, праяў кібераргэсіі, сэксуальных дэвіяцый. Аналізуецца змест стадый развіцця інтэрнет-дэвіяцый. Прапанаваны напрамкі прафілактыкі дэструктыўных з'яў у сеткавай прасторы, звязаныя з фарміраваннем інфармацыйнай культуры інтэрнэт-карыстальнікаў.*

***S. V. Venidziktau***

***Personal deviations in the space of internet communication***

*The article summarizes the main manifestations of deviations in the space of Internet communication, their causes and signs. The content of three groups of communicative deviations on the Web is revealed: various kinds of addictions, manifestations of cyber aggression, sexual deviations. The content of the development stages of Internet deviations is analyzed. Directions for the prevention of destructive phenomena in the network space, related to the formation of the information culture of Internet users, are proposed.*

Дэвіянтныя паводзіны — гэта ўстойлівыя паводзіны асобы (групы), якія адхіляюцца ад найбольш важных сацыяльных норм, наносяць рэальны ўрон грамадству або самой асобе (групе), а таксама суправаджаюцца яе сацыяльнай дэзадаптацыяй [1]. Віртуалізацыя сацыяльнага ўзаемадзеяння, выкліканая эвалюцыяй інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, выцясненнем традыцыйных відаў камунікацыі лічбавымі, развіццём інтэрнэт-прасторы як новага асяроддзя для рэалізацыі сацыяльных практык, прывяла да заканамернага пашырэння праяў дэвіяцыі. У сувязі з гэтым у якасці адносна новага сацыяльна-асобаснага феномену можна разглядаць камунікатыўныя дэвіяцыі, якія звязаны з адхіленнем ад сацыяльных і камунікатыўных норм узаемадзеяння ў інтэрнэт-асяроддзі. Дадзены тып дэвіяцый, на наш погляд, суадносіцца з узроўнем інфармацыйнай культуры асобы і адлюстроўвае агульны стан яе інфармацыйнай бяспекі (у шырокім разуменні гэтага тэрміна).

Перадумовамі распаўсюджвання дэвіяцый у інтэрнэце з'яўляюцца: узнікненне новых фактараў для рэалізацыі індывідуальнай схільнасці да залежных паводзін, кампенсацыя псіхалагічных комплексаў, адсутнасць звыклых этычных бар'ераў, адносная ананімнасць паводзін, магчымасць выкарыстання пераваг

інтэрнэт-камунікацыі для дасягнення палітычнай і / ці эканамічнай перавагі і інш. Адпаведна, варта весці гаворку пра тры асноўныя групы дэвіяцый у інтэрнэце: рознага роду залежнасці, праявы кіберагрэсіі, сэксуальныя дэвіяцыі.

Псіхолагамі вылучаецца пяць падтыпаў інтэрнэт-залежнасці:

а) кіберсэксуальная залежнасць — непераадольная цяга да наведвання порнасайтаў, абмеркавання сэксуальнай тэматыкі ў чатах або закрытых групах «для дарослых»;

б) залежнасць ад віртуальных знаёмстваў — празмерная колькасць знаёмых і сяброў у інтэрнэце, сістэматычныя новыя знаёмствы ў чатах, групавых гульнях і анлайн-марафонах;

в) паталагічная прыхільнасць да азартных гульняў у інтэрнэце, набыцця тавараў і паслуг або ўдзелу ў аўкцыёнах;

г) інфармацыйная перагрузка — паталагічная навігацыя, пошук інфармацыі па базах даных і пошукавых сайтах;

д) гульнявая залежнасць — непераадольнае імкненне праводзіць як мага больш часу ў камп'ютарных гульнях у анлайн-рэжыме [2].

Асноўнымі прыкметамі інтэрнэт-залежнасці з'яўляюцца:

а) талерантнасць: колькасць часу, які трэба правесці ў інтэрнэце, каб дасягнуць задавальнення, прыкметна ўзрастае;

б) сіндром адмовы: карыстальнік здзяйсняе спробы адмовіцца ад інтэрнэту або праводзіць у ім менш часу, што прыводзіць яго да дрэннага самаадчування, якое выяўляецца двума або больш сімптомамі: псіхаматорнае ўзбуджэнне, трывога, дакучлівыя разважанні аб тым, што зараз адбываецца ў Сетцы; адвольныя або міжвольныя рухі пальцамі, якія нагадваюць набор на клавіятуры.

У любой сваёй праяве інтэрнэт-залежнасць выклікае зніжэнне і парушэнне сацыяльнай, прафесійнай, іншай дзейнасці. Залежнасць можа выражацца колькасна (па часе, праведзеным у Сетцы) і якасна — па мэтах і задачах, якія вырашаюцца з дапамогай інтэрнэту. Адной з распаўсюджаных задач з'яўляецца атрыманне эмацыйнага задавальнення або іншай выгады з дапамогай агрэсіўных паводзін — т. зв. кібераграсіі. Гэтым тэрмінам абазначаецца форма дэвіянтных паводзін у інтэрнэт-асяроддзі, якая можа выражацца ў абразах, знявагах, здзеках, маніпуліраванні, агрэсіўных нападках, пераследах праз камунікатыўныя тэхналогіі. Агрэсары звычайна разлічваюць на ананімнасць і не прымаюць да ўвагі магчымасць наступлення адказнасці за свае дзеянні. Інтэрнэт-карыстальнікі, не асцерагаючыся патэнцыйнага пакарання, дазваляюць сабе значна больш, чым у звычайным жыцці, дзе за выказванні і ўчынкі даводзіцца несці адказнасць (па законах маралі, адміністрацыйнага або крымінальнага заканадаўства).

Асноўнымі формамі кіберагрэсіі выступаюць тролінг, кібербулінг і астратурфінг. Найбольш папулярнай формай негатыўных паводзін у інтэрнэце з'яўляецца тролінг, які можа быць вызначаны як від віртуальнай камунікацыі з парушэннем этыкі, што выяўляецца ў выглядзе праяў розных форм агрэсіўных, здзеклівых і абразлівых паводзін. Галоўнай мэтай тролінгу становіцца стварэнне канфлікту паміж суразмоўцамі і ўцягванне іх у канфрантацыю шляхам размяшчэння правакацыйных паведамленняў. Сярод асноўных матываў тролінгу вылучаюцца:

а) ананімны пошук увагі: імкненне дамінiраваць у дыскусіі, закранаючы іншых удзельнікаў і выклікаючы іх гнеўную рэакцыю;

б) імкненне пазабавіцца;

в) варожасць ў адносінах да групы або пэўнай сістэмы поглядаў;

г) самасцвярджэнне;

д) камерцыйныя мэты: правакацыйныя выказванні, якія прыводзяць да зрыву канструктыўнай камунікацыі па ўказанні заказчыка агрэсіі.

Паддаючыся на правакацыі, удзельнікі дэструктыўнай камунікацыі пачынаюць бессэнсоўныя дыскусіі. У выніку такіх зносін інтэрнэт-карыстальнікі могуць адчуваць эмацыйнае знясіленне, варожасць, зніжэнне даверу да групы, страту матывацыі да далейшых зносін. Для прадухілення негатыўных псіхалагічных эфектаў тролінгу карыстальнікам інтэрнэту варта ўмець распазнаваць правакацыі ў сеткавых зносінах і не паддавацца на іх.

Кібербулінг — агрэсіўныя, наўмысныя дзеянні, якія здзяйсняюцца групай асоб або адной асобай з выкарыстаннем электронных форм камунікацыі, паўтараюцца неаднаразова ў дачыненні да ахвяры, якой цяжка абараніць сябе [3]. Асяроддзем праяў кібербулінгу ў інтэрнэце з'яўляюцца сацыяльныя сеткі, блогі, форумы, электронная пошта, чаты, вэб-старонкі, мэсанджары. З прычыны значнай папулярнасці сярод падлеткаў сацыяльныя сеткі сталі галоўнай пляцоўкай для кібербулінгу, які можа мець разнастайныя формы рэалізацыі:

а) харасмент (прыгнёт, абраза) — перыядычная рассылка ахвяры паведамленняў, якія змяшчаюць абразы, непрыстойныя прапановы, здзеклівыя заўвагі адносна знешнасці, асаблівасцей гаворкі і паводзін;

б) флеймінг — абмен эмацыйнымі рэплікамі абразлівага зместу, агрэсіўны дыялог, які адбываецца часцей за ўсё ў публічнай перапісцы з вялікай колькасцю ўдзельнікаў;

в) дыскрэдытацыя — распаўсюджванне паклёпу, чутак праз наўмыснае публічнае размяшчэнне і рассылку тэкставых паведамленняў, фота, відэа, якія змяшчаюць ілжывую і зневажальную інфармацыю;

г) імперсанацыя — выкарыстанне імені іншага чалавека ў выглядзе рассылкі з узламанага або падробленага акаўнта ахвяры негатыўнай ці неадэкватнай інфармацыі;

д) астракізм — сацыяльная ізаляцыя, выключэнне ахвяры з групы сацыяльнай сеткі, «спісу сяброў», занясенне ў «чорны спіс»;

е) кіберсталкінг — сістэматычны пераслед ахвяры праз маніпулятыўныя паведамленні, пагрозы супрацьзаконных дзеянняў і пашкоджанняў, дамаганняў [4].

Астратурфінг можа быць аднесены да ўскосных відаў кіберагрэсіі, бо напрамую не звязаны з эмацыйна-псіхалагічным уздзеяннем на канкрэтнага карыстальніка: у дадзеным выпадку мы маем справу з уплывам на «калектыўнага» карыстальніка [5]. Астратурфінг уяўляе сабой тэхналогію штучнага стварэння грамадскай думкі шляхам размяшчэння шматлікіх заказных публікацый, аформленых як незалежныя меркаванні прыватных асоб. Агрэсія ў дадзеным выпадку выяўляецца праз гвалтоўнае ўкараненне ў масавую свядомасць выгадных для маніпулятара ідэй з выкарыстаннем вербальных, візуальных, мультымедыйных інструментаў скажэння медыярэальнасці [6]. Астратурфінг шырока ўжываецца ў бізнэсе з мэтай прыцягнення кліентаў і павышэння прыбытку альбо ачарнення канкурыруючых кампаній, а таксама ў палітыцы з мэтай умацавання падтрымкі той ці іншай палітычнай сілы. Мы разглядаем астратурфінг як нядобрасумленную практыку і дысфункцыянальную з'яву, што ўводзіць вялікую колькасць людзей у зман, а таксама падрывае давер да сапраўдных грамадскіх ініцыятыў, якія могуць быць расцэнены як неістотныя. Прынцыпова, што менавіта інтэрнэт-прастора стварыла камунікатыўную пляцоўку для ўкаранення астратурфінгу ў масавую практыку.

Асаблівую небяспеку ўяўляе некантралюемае выкарыстанне інтэрнэту дзецьмі і падлеткамі з пашырэннем сэксуальных дэвіяцый. Распаўсюджванне атрымалі такія дэструктыўныя з'явы, як сэкс-чатынг, сэкстынг, сэксторшн, грумінг.

Секс-чатынг (англ. sex-chatting) — электронная перапіска эратычнага характару. Секстынг (англ. sexting) — абмен эратычнымі паведамленнямі і фота. Небяспека гэтых камунікатыўных дэвіяцый заключаецца ў рызыцы ўцягвання ў адпаведныя дзеянні зламыснікамі непаўналетніх, што з'яўляецца парушэннем прынцыпаў грамадскай этыкі і маралі. З іншага боку, існуе рызыка свядомага і актыўнага ўдзелу непаўналетніх у праявах сэксуальных дэвіяцый.

Больш сур'ёзныя прававыя наступствы цягнуць за сабой праявы сэксторшн і грумінгу. Сексторшн (англ. sextortion) — шантаж у інтэрнэце з выкарыстаннем матэрыялаў інтымнага характару. Грумінг (англ. grooming) — дзеянні зламыснікаў па спакушэнні дзяцей у інтэрнэце.

Колькасць злачынстваў, звязаных з такімі дзеяннямі, у Беларусі расце. У інтэрнэце распаўсюджваюцца нават падрабязныя інструкцыі (складзеныя дастаткова прафесійна), дзе пакрокава апісваюцца дзеянні па схіленні непаўналетніх да дзеянняў сэксуальнага характару. Адной з прычын таго, што непаўналетнія аказваюцца ахвярамі названых з'яў, становіцца неразвітая здольнасць да крытычнай ацэнкі таго, што адбываецца, інфантыльнасць, празмерная даверлівасць.

Незалежна ад характару і скіраванасці праяў дэвіяцый у інтэрнэт-прасторы можна вылучыць асноўныя стадыі іх развіцця:

1. Захапленне аб'екта дэвіяцыі новай актыўнасцю, што шкодзіць іншым важным заняткам. Суправаджаецца аназагнозіяй (адсутнасцю крытычнай ацэнкі негатыўных змен у сацыяльна-псіхалагічнай і камунікатыўнай сферы).

2. Абстынентная стадыя, якая ўключае ў сябе парушэнне ўвагі, зніжэнне інтэлектуальнай працаздольнасці; эмацыянальную няўстойлівасць; самата-вегетатыўныя парушэнні.

3. Стадыя сацыяльнай дэзадаптацыі. З'яўляецца сталая патрэба ў сеткавых зносінах пры адсутнасці адчувальнага задавальнення ад іх; дэпрэсіўны стан пры кароткатэрміновай адсутнасці доступу да Сеткі; нарастаючая апатыя, млявасць, звужэнне кола інтарэсаў, рэзкае зніжэнне актыўнасці; прафесійныя дэфармацыі, сямейныя праблемы, сацыяльная ізаляцыя.

4. Стадыя балансу (раўнавагі) вылучаецца ў якасці заключнага этапу камунікатыўных дэвіяцый, калі неабходнасць таго ці іншага віду дэструктыўнай актыўнасці адпавядае нармальнаму фізіялагічнаму стану чалавека [7].

Супрацьстаянне гэтым і іншым негатыўным камунікатыўным з'явам магчыма толькі ў выпадку сумеснай дзейнасці дзяржаўных органаў, праваахоўных структур, арганізацый грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, з 2017 года ў Беларусі развіваецца праект Pomogut.by, адзін з напрамкаў якога — прафілактыка злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі асобы. Меры ні ў якім разе не павінны быць звязаны з татальным кантролем інтэрнэту: неабходна развіваць інфармацыйную культуру грамадзян, удасканальваць спосабы прафілактыкі і выяўлення праяў інтэрнэт-дэвіяцый, ствараць адпаведную заканадаўчую базу. Змяненні ў Законе аб СМІ, прынятыя ў Беларусі ў апошнія гады, накіраваны, у тым ліку, на гарантыі бяспечнага выкарыстання інтэрнэт-рэсурсаў. Уведзена абавязковая ідэнтыфікацыя асоб, якія размяшчаюць матэрыялы ў інтэрнэт-рэсурсах, дапускаецца магчымасць блакіравання работы сацыяльных сетак. Заканадаўча забаронена распаўсюджванне інфармацыі, якая прапагандуе суіцыд і іншыя акты аўтаагрэсіі, заахвочвае да іх здзяйснення.

Праблема прафілактыкі дэвіяцый у інтэрнэт-прасторы ўскладняецца адноснай латэнтнасцю іх праяў: рызыкі, звязаныя з дэструктыўнай (аўтадэструктыўнай) дзейнасцю суб'екта сеткавай камунікацыі, часта не з'яўляюцца відавочнымі, могуць не ўсведамляцца і аб'ектам уздзеяння. У сувязі з гэтым новае гучанне набывае пытанне фарміравання інфармацыйнай культуры на масавым узроўні, развіцця медыйнай граматнасці і візуальнай культуры як фактараў забеспячэння інфармацыйнай бяспекі інтэрнэт-карыстальнікаў. Асноўныя напрамкі тут звязаны з фарміраваннем навыкаў:

а) распазнання магчымага дэструктыўнага ўздзеяння розных форм інтэрнэт-камунікацыі на асобу;

б) рэагавання на агрэсіўныя стратэгіі, якія выкарыстоўваюцца ў дачыненні да асобы;

в) прытрымлівання ўстаноўкі на выкананне патрабаванняў лічбавай гігіены;

г) свядомага развіцця кампанентаў інфармацыйнай культуры на індывідуальным узроўні.

Такім чынам, існуючыя рызыкі развіцця і распаўсюджвання дэвіяцый у Інтэрнэце патрабуюць і новых падыходаў да фарміравання інфармацыйнай граматнасці насельніцтва і ўдасканалення дзейнасці праваахоўных структур.

1. Психология девиантного поведения : учеб. пособие / С. В. Венидиктов, С. И. Даниленко, Е. А. Ярошевич. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2017. 320 с. Вернуться к статье

2. Старшенбаум Г. В. Аддиктология: психология и психотерапия зависимостей. М. : Когито-Центр, 2006. 366 с. Вернуться к статье

3. Солдатова Г. У., Ярмина А. Н. Кибербуллинг: особенности, ролевая структура, детско-родительские отношения и стратегии совладания // Нац. психол. журн. 2019. № 3 (35). С. 17–31. Вернуться к статье

4. Бочавер А. А., Хломов К. Д. Кибербуллинг: травля в пространстве современных технологий // Психология. Журнал высшей школы экономики. 2014. № 3. С. 177–191. Вернуться к статье

5. Венидиктов С. В. Искажение медиареальности: технологии манипулирования и стратегии противодействия : моногр. / Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2022. 192 с. Вернуться к статье

6. Венідзіктаў С. В. Ад чутак — да дыпфэйкаў. Інструменты маніпуліравання ў медыяпрасторы // Thesaurus : зб. навук. пр. ; пад агул. рэд. С. В. Венідзіктава. Магілёў : Магілёўс. ін-т МУС, 2022. Вып. XI. Гістарычныя і палітычныя навукі. С. 38–46. Вернуться к статье

7. Юрьева Л. Н., Больбот Т. Ю. Компьютерная зависимость: формирование, диагностика, коррекция и профилактика : моногр. Днепропетровск : Пороги, 2006. 196 с. Вернуться к статье